Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 6 ад 8 студзеня 2013 г.

# Аб прысудджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2012 года

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры і савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва,

**пастанаўляю:**

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, тэатральнага мастацтва, мастацкай літаратуры, кінавідэамастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, музейнай і бібліятэчнай справы, выхаванні творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2012 года:

**Адамовіч Галіне Валянцінаўне, кінарэжысёру вышэйшай катэгорыі студыі «Летапіс» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»,** — за стварэнне дакументальных фільмаў «Маляваны рай», «Інакіня», «Стаць першым»;

**аўтарскаму калектыву Тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» у складзе Кашперава Аляксандра Барысавіча, вядучага майстра сцэны, Кірэева Алега Віктаравіча, рэжысёра-пастаноўшчыка, Мішчанчука Уладзіміра Андрэевіча, вядучага майстра сцэны,** — за выдатныя творчыя дасягненні, стварэнне спектакля «Хто смяецца апошнім» па п'есе К.Крапівы;

**калектыву дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска»** — за стварэнне мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, актыўную работу па папулярызацыі яго творчай спадчыны;

**калектыву Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея аддзела культуры Дрыбінскага райвыканкама Магілёўскай вобласці** — за выдатныя дасягненні ў справе захавання і развіцця традыцыйнага шапавальнага промыслу;

**калектыву дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь»** — за значныя дасягненні ў развіцці беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва, пастаноўку оперы Д.Смольскага «Сівая легенда»;

**калектыву дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»** — за значны ўклад у развіццё бібліятэчнай справы, рэалізацыю комплексу мерапрыемстваў па захаванні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Беларусі;

**калектыву ўстановы «Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы»** — за вялікую працу па захаванні і папулярызацыі літаратурнай спадчыны Янкі Купалы;

**народнаму тэатру гумару, гульні і песні «Хмелеўскія валацугі» Хмелеўскага сельскага дома культуры Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці** — за значны ўклад у адраджэнне і развіццё традыцыйнай рэгіянальнай культуры, народнага гумару, песеннага і танцавальнага мастацтва;

**Пякуцька Альбіне Васільеўне, загадчыку кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,** — за значны асабісты ўклад у выхаванне творчай моладзі, захаванне і развіццё традыцый беларускай школы акадэмічных спеваў;

**Чэбаганаву Анатолю Васільевічу, члену грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі»,** — за ўклад у вывучэнне і прапаганду духоўнай і культурнай спадчыны, стварэнне серыі гісторыка-дакументальных кніг «Я — сын Ваш», прысвечаных дваранскім родам Беларусі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2012 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр Лукашэнка**

*8 студзеня 2013 г.*
*г. Мінск*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ